Литература:

1. Русская грамматика : в 2 т. / АН СССР, Ин-т русского языка; редкол.: Н. Ю. Шведова (гл. ред.) [и др.]. – М. : Наука, 1980. – Т. 1 : Фонетика. Фонология. Ударение. Интонация. Словообразование. Морфология. – 789 с.

2. Кубрякова, Е. С. О разноструктурных единицах номинации и месте производного слова среди этих единиц / Е. С. Кубрякова // Słowotwórstwo a inne sposoby nominacji : materiały z 4 konferencji Komisji Słowotwórstwa przy Międzynarodowym Komitecie Sławistów. – Katowice : Gnome, 2000. – S. 24–31.

## ДАЛУЧЭННЕ ЗАМЕЖНЫХ СТУДЭНТАЎ ДА КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСАЎ СРОДКАМІ МУЗЕЙНАЙ ПЕДАГОГІКІ

**Сняжыцкая А. С.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Репозиторий ГрГМУ

Музей беларускай этнаграфіі Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта – адзіны музей падобнага тыпу ў медыцынскіх навучальных установах Рэспублікі Беларусь. Прадстаўленыя экспанаты адлюстроўваюць гаспадарчую дзейнасць, хатні побыт, абрадавую практыку, узоры мастацкай творчасці сялян.

Характэрным для музейнай экспазіцыі з'яўляецца адкрытае захаванне прадметаў, што садзейнічае выкарыстанню інтэрактыўных форм работы: наведвальнікі могуць паспрабаваць самастойна адпрасаваць бялізну, уявіць працэс апрацоўкі ільну, таўчэння круп, збівання масла і інш.

Напрамкі музейнай работы:

– этнаграфічны (збор экспанатаў для папаўнення музейнага фонда, абнаўленне і стварэнне новых раздзелаў экспазіцый, класіфікацыя экспанатаў, вывучэнне гісторыі стварэння экспанатаў і інш.);

– пошукава-даследчы (лекавыя традыцыі беларусаў, народны каляндар беларусаў, традыцыі беларускай сям'і, беларускае адзенне, народныя гульні і інш.);

– творчы (наладжванне экскурсій, работа гісторыка-этнаграфічнага клуба “Спадчына”).

Адным з прыярытэтных напрамкаў работы музея з'яўляецца не толькі патрыятычнае выхаванне беларускіх студэнтаў, але і далучэнне замежных студэнтаў да культурнай спадчыны беларусаў сродкамі музейнай педагогікі.

На пытанне экскурсавода: “З якімі падзеямі, сімваламі ці персанажамі вы звязваеце Беларусь?”, часцей за ўсе можна пачуць адказ: “З добрай якасцю прадуктаў харчавання, чысцінёй і бяспекай, а таксама з бульбай”.

Таму падчас правядзення экскурсій з земежнымі студэнтамі, у якіх выкладанне ўсіх прадметаў вядзецца на рускай мове, засяроджваецца ўвага на тым, што Рэспубліка Беларусь – незалежная суверэнная дзяржава. Як і ўсе незалежныя дзяржавы, яна мае дзяржаўныя сімвалы. Традыцыйна, на пытанне аб дзяржаўных сімвалах, студэнты без цяжкасці адказваюць, што гэта, як і ў любой дзяржаве, – герб, гімн і сцяг. А вось, што лічыцца неафіцыйнымі сімваламі Рэспублікі Беларусь, замежныя грамадзяне ведаюць вельмі мала. Менавіта таму адной з задач такіх экскурсій з’яўляецца далучэнне да культурна-гістарычнай спадчыны беларусаў, фарміраванне паважлівага стаўлення да нацыянальных традыцый і звычаяў беларускага народа, да яго ідэалаў, пачуццяў і інтарэсаў.

Сапраўды, акрамя сцяга, герба і гімна, Беларусь мае свае неафіцыйныя сімвалы, якія з’яўляюцца візітнымі карткамі нашай краіны. Крыж Святой Ефрасінні, зроблены ў XII стагоддзі і згублены падчас Вялікай Айчыннай вайны, з'яўляецца духоўным сімвалам краіны.

Брэсцкая крэпасць – сімвал гераізму і стойкасці, дзе ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны была спынена фашысцкая армія.

Зубр, які жыве ў Белавежскай пушчы, самым буйным старажытным лесе Еўропы, – сімвал магутнасці краіны.

Белы бусел – сімвал міру, сімвал бяссмерця зямлі. А яшчэ бусел лічыцца прадвеснікам шчасця і заступнікам дому. Спрадвеку беларусы верылі, што бусел прыносіць дзяцей, і там, дзе ен пасяліўся, жывуць багацце і дабрабыт.

Кожны ўзор беларускага арнаменту – гэта сімвал ураджаю, стваральнай працы, шчасця, святаў, павагі да продкаў, кахання, любві. Дарэчы, беларусы – адзіная нацыя, якая змагла захаваць першапачатковы выгляд арнаменту, які існаваў яшчэ задоўга да прыняцця хрысціянства. Таму не выпадкова, што пры афармленні Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь таксама выкарыстоўваецца арнамент, які сімвалізуе шчодрасць, сардэчнасць, адкрытасць нашых людзей усім народам-суседзям.

Ручнік – сімвал чысціні і роднай хаты. Для беларусаў ручнік – не проста рэч хатняга выкарыстання, але ж і нацыянальная каштоўнасць. Мова вышыўкі, не горш за словы, можа расказаць гісторыю беларускага народа. Яна адкрывае нам цэлы свет вобразаў, падзей, вераванняў і лесаў многіх пакаленняў беларусаў. Менавіта таму ручнікі – адзін з найбольш цікавых феноменаў традыцыйнай беларускай культуры. Яны суправаджаюць чалавека на працягу ўсяго жыцця (ад нараджэння да смерці), звязваючы яго з духоўнай спадчынай, пакінутай папярэднімі пакаленнямі, а таксама культурай і звычаямі продкаў. На ручніку што ні ўзор, то сімвал. Арнамент беларускіх традыцыйных тканін – гэта жаночая мова, якая за доўгі перыяд свайго функцыянавання ўвабрала ў сябе значэнні і сэнсы слоў і сказаў featuring рознага па часу паходжання.

Лен – «беларускі шоўк» – сімвал багацця і дабрабыту. На беларускай зямлі лен вырошчваецца са старажытных часоў. Адзіная прадзільная культура на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь трывала ўвайшла ў жыцце нашых продкаў.



Репозиторий ГрГМУ

З валакна ткалі палатно і шылі вопратку, стваралі прадметы побыту, майстравалі цацкі для дзяцей. Ен апранаў, саграваў, лячыў, выкарыстоўваўся ў самых важных народных абрадах. У спісе 26-ці краін свету, якія займаюцца вырошчыаннем і апрацоўкай ільну, наша краіна ўваходзіць у першую пяцерку. Нездарма блакітныя кветкі ільну ўпрыгожваюць сучасны герб Беларусі.

Васілек (валошкі) – гэта нацыянальны сімвал, які народжаны самой гармоніяй прыроды, жывой красой неба, жытняга поля, ракі, лесу. Ен увасабляе сам беларускі народ: сціплы, талерантны, прыязны, гасцінны.

Беларусаў называюць «бульбашамі». Карняплод стаў своеасаблівым сімвалам беларускай нацыянальнай культуры. Што такое бульба для беларуса? Хоць яе і называюць другім хлебам, але ядзім мы яе куды больш. Бульба – аснова беларускай нацыянальнай кухні. З яе можна прыгатаваць больш за тысячу страў. А калі штодзень гатаваць новую страву – пройдзе тры гады, пакуль мы не пакаштуем іх усе.

Наша краіна з вялікім гонарам носіць імя, якое з’яўляецца сімвалам барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі – «рэспубліка-партызанка». Рэспублікай-партызанкай наша краіна атрымала права называцца за магутны патрыятычны рух у адзін з найбольш складаных перыядаў гісторыі – гады Вялікай Айчыннай вайны. У гады гітлераўскай акупацыі на тэрыторыі Беларусі дзейнічала звыш 1200 партызанскіх атрадаў, дзе змагаліся больш за 370 тысяч народных мсціўцаў, якія сваімі рашучымі дзеяннямі зрывалі планы гітлераўцаў, тым самым набліжаючы Вялікую Перамогу [1].

Беларусь называюць «сінявокай» з-за вялікай колькасці водных аб'ектаў: 20800 рэк, ручаеў і больш за 11 тысяч азер. Гэта назва адлюстроўвае прыродную асаблівасць краіны, дзе многія вадаемы, асабліва на поўначы (у Беларускім Паазер'і), маюць ледніковае паходжанне і адрозніваюцца крышталева чыстай, блакітнай вадой [2].

А яшчэ Беларусь – гэта «легкія Еўропы», таму што ў нас каля 7000 балот. На працягу года адзін гектар балота ў 7-15 разоў больш, чым гектар лесу, паглынае вуглякіслага газу і ў столькі ж разоў больш, чым лес, вылучае кіслароду. Праз балоты адбываецца натуральная фільтрацыя вады і паветра. Вось таму балоты называюць «легкімі планеты» [3].

А з нядаўняга часу Рэспубліка Беларусь асацыіруецца з «геаграфічным цэнтрам Еўропы», які знаходзіцца ў Полацку, пра што кажа памятны знак, усталяваны ў горадзе ў кропцы з каардынатамі 55 градусаў 30 хвілін паўночнай шыраты і 28 градусаў 48 хвілін усходняй даўгаты. Кожны жадаючы можа атрымаць сертыфікат пра тое, што ен пабываў у цэнтры Еўропы [4].

Такім чынам, дзякуючы больш глыбокаму знаемству замежных студэнтаў з гісторыя і культурай беларусаў, адбываецца фарміраванне паважлівага стаўлення да нацыянальных традыцый і звычаяў беларускага народа, да яго ідэалаў, пачуццяў і інтарэсаў. Усе гэта таксама садзейнічае паспяховай адаптацыі замежных грамадзян да новага сацыякультурнага асяродзя.



Репозиторий ГрГМУ

Літаратура:
1. «Партизанская работа – это искусство» – URL: https://storyofvictory.sb.by/partisan (дата обращения: 15.09.2024).
2. Азеры Беларусі на інтэрактыўнай карце – URL: https://mapbelarus.by/map/lakes/ (дата звароту: 16.09.2024).
3. Белорусское Полесье – легкие Европы – URL: https://na-ozero.by/blog/belarus-polese/ (дата обращения: 10.09.2024).
4. Географический центр Европы – URL: https://www.tripadvisor.ru/ Attraction_Review-g1234777-d5504632-Reviews-Geographical_Midpoint_of_Europe-Polotsk_Vitebsk_Region.html (дата обращения: 10.09.2024).

## ФОРМИРОВАНИЕ ПРЕДМЕТНЫХ КОМПЕТЕНЦИЙ ПРИ ИЗУЧЕНИИ МОРФОЛОГИИ НА УРОКАХ РУССКОГО ЯЗЫКА

**Токурова Ч. М.**

Ошский государственный университет
г. Ош, Кыргызская Республика

Репозиторий ГрГМУ

Современное школьное образование ориентировано на формирование у обучающихся системы компетенций, обеспечивающих их успешную учебную и социальную деятельность. В соответствии с требованиями государственного образовательного стандарта основного общего образования особое значение приобретает развитие предметных компетенций, отражающих уровень освоения содержания конкретной учебной дисциплины.

Русский язык как учебный предмет обладает значительным потенциалом для формирования предметных компетенций, поскольку объединяет знания о языке как системе, умения практического владения речью и навыки языкового анализа. В этом контексте особую роль играет морфология, изучаемая в 6 классе, так как именно на этом этапе школьники осваивают грамматические категории частей речи и принципы их функционирования в речи.

Актуальность исследования обусловлена необходимостью методически обоснованного подхода к формированию предметных компетенций при изучении морфологии, а также потребностью в обновлении традиционных методов обучения с учетом компетентностной парадигмы образования.

Понятие предметных компетенций в современном образовании. В педагогической науке понятие компетенция трактуется как интегративное образование, включающее знания, умения, навыки и опыт их применения в учебных и жизненных ситуациях [1, с. 36]. Предметные компетенции связаны с конкретной областью знания и отражают степень овладения учащимися содержанием учебного предмета.

По мнению А. В. Хуторского, предметные компетенции формируются в процессе усвоения предметных знаний и способов деятельности, проявляются